This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2022.pp.119-132

Przegląd Środkowo-Wschodni, 7, 2022
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20220706

Data przesłania: 24.06.2022
Data akceptacji: 24.07.2022

**Наталля Барабаш**
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
barabash-n@bk.ru
ORCID: 0000-0002-9771-9411

# Стварэнне і дзейнасць жаночых дэлегацкіх сходаў у БССР у 1920-х – сярэдзіне 1950-х гг.

**Utworzenie i działalność zebrań delegatów kobiet w BSRS w latach 20.–50. XX wieku**

Rząd sowiecki przywiązywał dużą wagę do pracy z kobietami. Przede wszystkim tłumaczono to chęcią zaangażowania kobiet w aktywną działalność partyjno-sowiecką, związkową i komsomolską. Najczęstszą formą takiej pracy były zebrania delegatów, które powstały na początku lat 20. i były aktywną formą włączania kobiet w życie społeczno-polityczne społeczeństwa sowieckiego do połowy lat 50. XX w. Zebrania delegatów, jako forma organizacji społecznej kobiet, wykorzystywały takie formy aktywności tak teoretyczne – studiowanie twórczości klasyków marksizmu-leninizmu oraz wybitnych postaci partii i rządu, jak i praktyczne – dobór i promocja kobiet do kierowania pracą partyjno-sowiecką, związkową i gospodarczą.

Słowa kluczowe: kobiety, praca partyjno-sowiecka, praca związkowa i komsomołowa, zebrania delegatów kobiet, Białoruś, działalność polityczna

Савецкая ўлада з першых дзён свайго існавання адным з важнейшіх накірункаў сваёй працы вылучала працу сярод жанчын. Галоўным у гэтай працы з'яўлялася прыцягненне жанчын да актыўнай грамадска-палітычнай працы і іх вылучэнне на кіруючыя пасады ў партыйна-савецкім, гаспадарчым, прафсаюзным, камсамольскім

апараце. Дадзены артыкул прысвечаны аналізу палітыкі Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б) у працы з жанчынамі і адной з асноўных форм гэтай палітыкі – дэлегацкіх сходаў.

Дэлегацкія сходы – як адна з важных форм працы з жанчынамі з’явіліся ў другой палове 1919 г. з заснаваннем у партыйных структурах аддзелаў па рабоце сярод жанчын (жанаддзелы). Адным з асноўных накірункаў іх працы з’яўлялася “вовлечение женских масс в социалистическое строительство”[1]. Іх праца падзялялася на дзве часткі: тэарэтычную – вывучэнне асноў марксізму-ленінізму, палітычная адукацыя і практычную – адбор і вылучэнне найбольш актыўных і здольных да арганізатаскай і адміністрацыйнай працы жанчын на кіруючыя пасады ва ўсіх органах дзяржаўнай улады і кіравання.

У першыя гады савецкай улады ў Беларусі статус дэлегацкіх сходаў не быў заканадаўча замацаваны. Фактычна гэта быў грамадскі рух, які кантраляваўся жанаддзеламі. Інстытуалізацыя дэлегацкіх сходаў адбылася на VIII Усерасійскім з’ездзе саветаў рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх і казацкіх дэпутатаў 28 снежня 1920 г., на якім была прынята спецыяльная пастанова “О привлечении женщин к хозяйственному строительству”, у якой, у тым ліку падкрэслівалась неабходнасць:

> Привлечь работниц и крестьянок во все экономические органы, разрабатывающие и осуществляющие общехозяйственный план, вовлекать их в заводоуправления, в фабрично-заводские комитеты и в правления профессиональных союзов[2].

Улічваючы гэтае рашэнне аддзел па рабоце сярод жанчын ЦК РКП(б) прапанаваў УЦВК СССР зацвердзіць гэтую пастанову, каб заканадаўча замацаваць яе. 11 красавіка 1921 г. на аснове даклада наркама юстыцыі Зміцера Курскага на паседжанні Малога СНК СССР

---

[1] И.В. Алферова, *Делегатские собрания 1920-х гг. как проект подготовки жанщин к управленческой деятельности,* «Вестник Челябинского государственного университета» № 1, вып. 43, с. 46–54.

[2] Тамсама, с. 48.

была аднагалосна прынята пастанова «О привлечении работниц и крестьянок к работе в советских учреждениях», якая юрыдычна замацоўвала ўдзел жанчын у працы дзяржаўных і савецкіх устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў[3]. У пастанове падкрэслівалася:

> С целью установления связи советских учреждений с широкими массами трудящихся, оживления советского аппарата и постепенного освобождения его от бюрократических элементов, Совет Народных Комиссаров признал целесообразным и необходимым привлекать к практической работе в Отделы исполкомов и его учреждения работниц и крестьянок через Отделы работниц Российской Коммунистической партии[4].

Паколькі КП(б)Б фактычна падпарадкоўвалася ЦК РКП(б), то, безумоўна, гэтыя рашэнні самым непасрэдным чынам закраналі Беларусь, дзе таксама былі створаны дэлегацкіх сходы жанчын і пачаўся працэс іх “уцягвання” у савецкае будаўніцтва, улічваючы асаблівасці развіцця Беларусі. Аднак гэта адбылося крыху пазней, што тлумачылася польска-савецкай вайной і толькі пасля другога абвешчання БССР (31 ліпеня 1920 г.), кампартыя Беларусі пачала надаваць працы сярод жанчын значную ўвагу. На VII з’ездзе КП(б)Б (20–26 красавіка 1923 г.) была прынятая рэзалюцыя “О работе среди работниц и крестьянок», у якой падкрэслівалася:

> Одним из методов влияния на широкие беспартийные массы в новых условиях остаются по-прежнему делегатские собрания. Делегатские собрания имеют своей задачей объединить вокруг партии, Советов и профсоюзов отсталые слои работниц и крестьянок, втянуть их в круг общественной жизни, производства и научить вести определенную практическую работу по советскому, партийному и профессиональному строительству[5].

---

[3] Тамсама, с. 48.

[4] Тамсама, с. 50.

[5] *Коммунистическая партия Белоруссии в революциях и решениях съездов и пленумов ЦК*, Т.1. 1918–1927. Под ред.: В.И. Бровикова, В.Я. Крыкова, С.Е. Павлова, Минск 1983, с. 152.

Першапачаткова, члены дэлегацкіх сходаў абіраліся па адной ад 50 чалавек. У 1922 г. норма прадстаўніцтва пры выбарах дэлегатак была зменена: па адной ад 25 працуючых жанчын. У 1925 г. ЦК УКП(б) прыняў новае палажэнне аб дэлегацкіх сходах, у адпаведнасці з якім адна дэлегатка абіралася ад 10 працуючых, а ад жанчын-служачых – па адной ад 100[6]. Першапачаткова дэлегаткі абіраліся тэрмінам на 3, у 1921 г. – 4, у 1922 г. – 6 месяцаў, а пасля 1923 г. – на год. Аднак, у рэзалюцыі нарады работнікаў сярод жанчын, якая адбылася ў 1924 г., тэрмін работы дэлегатак быў зменшаны да чатырох месяцаў у горадзе і да шасці месяцаў у вёсцы[7]. Гэтае палажэнне дзейнічала на працягу 1920-х–1930-х гг.

Кампартыя Беларусі на пачатку 1920-х адзначала дасягненні ў працы сярод жанчын. На XII Усебеларускай партканферэнцыі падкрэслівалася, што:

> В работе среди женщин достигнуты значительные результаты. Наблюдавшийся раннее момент отрыва женотделов от партийной работы изжит. Наблюдается углубление и расширение работы среди широких слоев работниц и крестьянок, вовлечение их в общественную жизнь[8].

Адзначым, што праца сярод жанчын у БССР вялася не ўвогуле, а па нацыянальнай прыкмеце. На канферэнцыі адзначалася, што ў Беларусі існуюць чатыры найбольш значныя нацыі: рускія, беларусы, яўрэі і палякі. Партыя ўлічвала гэты момант у працы сярод жанчын і ў апараце жаночага аддзелу ЦК КП(б)Б былі вылучаны спецыяльныя інструктары, якія працавалі сярод жанчын "сваёй" нацыянальнасці[9].

Аднак, сцверджанне аб "пашырэнні" работы сярод жанчын і вылучэнні іх на кіруючую партыйна-савецкую працу была вельмі

---

[6] И.В. Алферова, *Делегатские собрания 1920-х гг. как проект...*, с. 53.
[7] Тамсама, с. 57.
[8] НАРБ, ф. 4п, оп.1, д.1182, л. 1.
[9] Тамсама, л. 10.

“аптымістычнай” і далекай ад рэальнасці. Так, вынікі выбараў у сельскія саветы ў 1926 г. паказалі, што ў члены сельскіх саветаў было абрана 8,2% жанчын, у той час як мужчын было абрана 91,8%. Яшчэ горшыя вынікі былі сярод абраных старшынь сельскіх саветаў, з якіх мужчын было абрана 1167 ці 99,4%, а жанчын толькі 8 ці 0,6%[10]. Крыху больш жанчын было абрана ў мястэчкавыя саветы, у якія мужчын было абрана 647 ці 87,6%, а жанчын толькі 92 ці 12,4%[11].

Выбары ў раённый выканаўчыя камітэты таксама засведчылі незначны працэнт жанчын абраных у гэтыя органы. Так, у склад членаў раённых выканаўчых камітэтаў было абрана ўсяго 1474 чалавекі, сярод якіх мужчыны складалі 1345 ці 91,2%, а жанчыны – 129 ці 8,8%[12]. Сярод старшынь райвыканкамаў не мелася ні адной жанчыны. Прыкладна такія ж лічбы назіраліся і пры выбарах у гарадскія саветы дэпутатаў працоўных. Усяго было абрана ў гэтыя органы 954 чалавекі, з якіх 861 ці 90,3% з’яўляліся мужчынамі і толькі 93 ці 9,7% былі жанчыны[13]. Аднак, нельга крытычна ставіцца да такой нязначнай колькасці абраных у выканаўчыя і заканадаўчыя органы раённага ўзроўню ўлады жанчын. Калі параўноўваць з пачаткам 1920-х гадоў, калі жанчын было літаральна адзінкі, то вынік па стану на канец 1926 г. магчыма лічыць поспехам улады па ўцягненню жанчын у працу ва ўладных структурах раеннага ўзроўню.

Цікавымі ўяўляюцца звесткі аб складзе дэлегацкіх сходаў у 1926 г. у сельскай мясцовасці. Усяго налічвалася па ўз’яднанай БССР 16 981 дэлагатка, з якіх беларусак было 14 766, поляк – 663, яўрэяк – 1047, іншых – 5283[14]. У працэнтных адносінах гэтыя лічбы выглядалі наступным чынам: у весцы 87% беларусак, 6% – яўрэяк, 4% – палячак і 3% іншых. У горадзе 43 беласусак, 35% – яўрэяк, 3%

---

[10] НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 2372, л. 93.
[11] Тамсама, л. 94.
[12] Тамсама, л. 92.
[13] Тамсама, л. 96.
[14] Тамсама, л. 143.

– палячак, 14% – рускіх і 4% – іншых[15]. Як вынікае, абсалютную большасць склалі беларускі, што адлюстроўвала нацыянальную перавагу беларусаў у грамадстве.

Дынаміка росту дэлегатак выразна назіраецца з моманту ўз'яднання БССР у 1926 г. Так, у 1924–1925 гг. мелася па ўсей Беларусі ў гарадах 1502 делагаткі, у 1925–1926 гг. адпаведна 2898. На вёсцы гэты ўзрост быў яшчэ большы: у 1924–1925 гг. мелася на весцы 9239 дэлегатак, ў 1925–1926 гг. стала 16 981[16]. Усяго ў 1926 г. было створана 472 дэлегацкіх схода. Па сацыяльнаму стану ў сельскіх дэлегацкіх сходах было 51% беднячак, 35,5 – сераднячак, 4% – батрачак, 2% – рабочых саўгасаў і 1,5% іншых – настаўніц, служачых і кустароў. У горадзе карціна выглядала наступным чынам: работніц – 55%, 30% жонак рабочых, 11% служачых і 3% кустарак[17]. Такім чынам, большасць дэлегатак склалі сялянкі і рабочыя, што адпавядала палітыцы партыі па стварэнні "ядра" пралетарскіх сіл у дэлегаціх сходах.

Значна меньшая колькасць дэлегатак прыпадала на гарадское насельніцтва. Так, па гарадах Беларусі па стану на канец 1926 г. мелася 2770 делегатак, з якіх беларусак налічвалася 1177, яўреяк – 974, рускіх – 373, поляк – 101[18].

Лічба 8–9% жанчын назіралася і сярод членаў прафсаюза. За 1925 г., г.зн. да ўзбуйнення Беларусі, з усей колькасці членаў прафсаюзаў у 11 224 чалавек жанчыны складалі 9,2%[19].

Нямецка-савецкая вайна перарвала гэты працэс і ў вайну гэтыя структуры не дзейнічалі. У пасляваенны час партыйна-савецкае кіраўніцтва зноў палічыла неабходным вярнуцца да такой формы работы з жанчынамі. Галоўным чынам гэтая праца разгарнулася ў заходніх абласцях Беларусі, бо трэба было "выхаваць і перавыха-

[15] НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 2915, л. 31.
[16] НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 2910, л. 49.
[17] НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 2915, л. 31.
[18] НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 2372, л. 144.
[19] НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 2378, л. 68.

вацьˮ жанчыну, якая амаль 20-ць год (з 1921 па1939 г.) знаходзілася пад “польскім прыгнетам і выхаваннемˮ у складзе польскай дзяржавы.

У Заходняй Беларусі гэтае пытанне набывала першачарговую задачу і на IX пленуме ЦК КП(б)Б (3–6 чэрвеня 1947 г.) была звернутая ўвага партыйна-савецкага кіраўніцтва абласнога і раённага ўзроўняў аб “уцягванніˮ жанчын у партыйную, савецкую, прафсаюзную, камсамольскую працу і іх вылучэнні на кіруючыя пасады. На пленуме адзначалася:

> Пленум ЦК требует от партийных организаций коренного улучшения массово-политической работы среди работниц, крестьянок, всех трудящихся женщин, оживления работы женских делегатских собраний, регулярного проведения собраний всех женщин Необходимо привлечь трудящихся женщин деревни к активной политической жизни, разъясняя им политику партии и Советской власти, текущие политические события, вовлекая их в борьбу за восстановление и подъём промышленности и сельского хозяйства, в дело строительства новой советской жизни в западных областях республики[20].

Выконваючы рашэнні IX пленума ва ўсіх заходніх абласцях Беларусі была адноўлена праца дэлегацкіх сходаў. Так, Баранавіцкі АК КП(б)Б ужо 18 чэрвеня 1947 г. паведамляў аддзелу ЦК КП(б)Б па рабоце з жанчынамі, што ў вобласці створана 232 дэлегацкія сходы, у якія абраныя 6907 жанчын[21].

У Маладзечненскай вобласці дэлегацкія сходы былі створаны напрыканцы 1946 г. Усяго было створана 242 дэлегацкія сходы, з якіх 230 было створана ў сельскай мясцовасці. Усе дэлегацкія сходы аб’ядналі 5856 дэлегатак і 2189 жанчын-актывістак. Сацыяльны склад усіх дэлегатак з’яўляўся наступным: работніц – 154, служачых – 627, сялянак-беднячак – 3689, сялянак-серадначак – 1386[22].

---

[20] *Коммунистическая партия Белоруссии в революциях и решениях съездов и пленумов ЦК*, Т.4. 1945–1955, Под ред.: Г.Г. Бартошевича, Минск 1986, с. 181.

[21] НАРБ, ф. 4п, оп. 29, д. 573, л. 1.

[22] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 21, л. 260.

Дэлегаткамі былі абраны “*лепшыя жанчыны, адданыя партыі і савецкай уладзе, жанчыны з работніц, сялянак, хатніх гаспадынь і мясцовай інтэлігенцыі*”[23]. Кіруючым органам дэлегацкага сходу з’яўляўся Савет дэлегацкага сходу, у які абіралася ад 3 да 7 чалавек. Савет дэлегацкага сходу зацвярджаўся на бюро РК, ГК і АК КП(б)Б.

Звернем увагу, што ў пасляваенны час змяніўся накірунак працы сярод жанчын у Беларусі. Калі ў 20–30-я гг. партыйна-савецкае кіраўніцтва рабіла акцэнт на далучэнне жанчын да працы ў “выканкамаў і яго ўстановах”, то зараз задача ставілася на пашырэнне і паглыбленне “сярод іх палітычна-масавай працы”. Другі важны момант, характэрны толькі для Беларусі, праца сярод жанчын пераважна заходніх абласцей Беларусі. Тлумачэнне гэтаму можа быць наступнае. Дадзены рэгіён быў інкарпараваны ў склад СССР толькі ў 1939 г. і да пачатку нямецка-савецкай вайны там не паспелі належным чынам разгарнуць гэтую працу. Таму ў пасляваенны час, улічваючы асаблівасці развіцця заходнебеларусскага рэгіёну, партыйна-савецкае кіраўнцтва рэспублікі звярнула асаблівую ўвагу на стварэнне дэлегацкіх сходаў у заходніх абласцях і развіцця сярод жанчын “масава-палітычнай працы”.

Адзначым, што ЦК КП(б)Б неаднаразова разглядаў пытанні аб працы сярод жанчын. Так, 28 чэрвеня 1947 г. ЦК КП(б)Б разглядзеў пытанне “Аб працы сярод жанчын у Брэсцкай вобласці”. У пастанове адзначалася, што ў вобласці працуе 228 дэлегацкіх сходаў, якія налічвали 6807 дэлегатак[24]. У час выбараў у мясцовыя саветы ў вобласці было абрана 1445 жанчын, з якіх: 18 у абласны савет, 148 – у раенныя, гарсаветы – 73, гарсаветы раеннага падпарадкавання – 68, сельскія саветы – 1138[25].

Разам з тым, ЦК кампартыі Беларусі адзначаў, што:

[23] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 19, л. 199.
[24] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 20, л. 45.
[25] Тамсама, с. 47.

большим недостатком в работе среди женщин является отсудствие должного внимания со стороны многих работников партийно-хозяйственного актива, которые выезжают в сельские советы по выполнению очередных мероприятий в деревне и проведению политической работы среди населения, не интересуются работой делегатских собраний, никогда не беседуют с председателями делегатских собраний, редко выступают перед женщинами с докладами и лекциями. Кроме того, недостаточно проводится работа по ликвидации неграмотности и малограмотности среди женщин[26].

Некаторыя партыйныя работнікі раённага і абласнога ўзроўню не надавалі працы сярод жанчым належнай увагі. Так, напрыклад, у Іванаўскім раёне Пінскай вобласці, у Мастоўскім раёне Баранавіцкай вобласці ў РК КП(б)Б нават не мелася загадчыка аддзелам па рабоце сярод жанчын, хаця адпаведная пасады ў наменклатуры РК КП(б)Б меліся[27].

Галоўнымі напрамкамі працы дэлегацкіх сходаў з'яўляліся наступныя: удзел у розных грамадска-палітычных кампаніях (выбары дэлегатаў ў саветы розных узроўняў, удзел у сходах, мітынгах і г.д.); ліквідацыя няпісменнасці сярод жанчын; дапамога шматдзетным, адзінокім жанчынам і г.д.

Важнае значэнне мелася вылучэнню жанчын на кіруючую работу. Так, па стану на верасень 1948 г. у Маладзечненскай вобласці з агульнай колькасці наменклатурных работнікаў было 952 чалавекі, з якіх толькі 82 жанчыны ці 8,5%[28]. У партыйным апараце ў раёнах вобласці працавала 58 жанчын з якіх сакратарамі ГК і РК КП(б)Б 1 чалавек, загадчыкамі аддзелаў – 15, загадчыкамі парткабінетаоў – 5, загадчыкамі статаддзелаў – 11, інструктарамі – 22, памочнікамі сакратароў – 2, прапагандыстамі – 2[29]. Разам з тым, як прызнавала партыйнае кіраўніцтва вобласці, гэтыя лічбы сведчылі аб тым, што

[26] Тамсама, с. 49.
[27] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 19, л. 282.
[28] Тамсама, л. 407.
[29] Тамсама, л. 407.

ў вобласці яшчэ мала працуе жанчын на кіруючых партыйна-савецкіх, гаспадарчых пасадах. Па стану на гэты ж час у вобласці налічвалася 5535 жанчын-дэлегатак, 2189 – актывістак, 1498 дэпутатаў мясцовых саветаў.

Не меньшая колькасць жанчын працавала і ў Брэсцкай вобласці. Так, у справаздачы Брэсцкага АК КП(б)Б адзначалася, што ў 1948 г. працавала 228 дэлегацкіх сходаў, якія налічвалі 6807 дэлегатак[30]. У Гродзенскай вобласці было створана 347 дэлегацкхі сходаў, якія аб'ядноўвалі 7716 жанчын. Усяго у Гродзенскай вобласці налічвалася 156 765 жанчын[31]. Гэта быў своеасаблівы рэзерв кадраў, з якіх магчыма было вылучаць на кіруючыя пасады жанчын.

Так, напрыклад, у Брэсцкай воблаці ў 1947 г. было ўлічана 8616 непісьменных жанчын. Па стану на канец 1946 г. было абвучана пісьменнасці 2984 жанчыны розных узростаў[32]. Яшчэ большая непісьменнасць назіралася ў Маладзечненскай вобласці. Па стану на чэрвень 1948 г. у вобласці мелася 20 015 непісьменных і 24 458 малапісьменных чалавек з іх жанчын непісьменных мелася 13 718, і малапісьменных – 16 108 чалавек[33]. Як вынікае з гэтых лічбаў, абсалютная большасць непісьменных і малапісьменных прыпадала менавіта на жанчын. Актыўная праца ў гэтым накірунку прынесла свай плён. Па стану на першае ліпеня 1948 г. было абвучана пісьменнасці 14 780 чалавек з іх 9212 жанчын і дзяўчат[34]. Адзначым, што на самай справе непісьменнасць сярод жанчын была масавай. Так, напрыклад, у весцы Доўгае, Даўгоўскага сельскага савета Быценскага раёна Баранавіцкай вобласці з 128 гаспадарак мелася 128 непісьменных і з іх 135 жанчын і дзяўчат. У весцы Сялец Дабрамысленскага сельсавета гэтага ж раёна з 230 гаспадарак 158 ча-

---

[30] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 20, л. 45.
[31] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 19, л. 199.
[32] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 20, л. 45.
[33] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 19, л. 113.
[34] Тамсама, л. 114.

лавек былі непісьменнымі і з іх 146 жанчын[35]. Для ліквідацыі непісьменнасці выкарыстоўваліся розныя формы: вечаровыя школы, лікбезы, індывідуальныя заняткі з непісьменнымі. Так, напрыклад, у Байкоўскім сельсавеце Астравецкага раёна Маладзечненскай вобласці старшыня дэлегацкага сходу Лінкевіч навучыла пісьменнасці 37 непісьменных жанчын[36]

Актыўная праца дэлегацкіх сходаў па ліквідацыі непісьменнасці прынесла свой плён. Так, у верасні 1949 г. Брэсцкі АК КП(б)Б паведамляў у ЦК кампартыі Беларусі, што ў вобласці пасля вайны было ўлічана 17 869 непісьменных жанчын, а к верасню 1949 г. ліквідавалі непісьменнасць 14 833 жанчыны і засталося ў вобласці непісьменных усяго 3036 жанчын[37].

Не менш актыўна дэлегаткі бралі ўдзел у выбарах у мясцовыя саветы. Так, у выбарах у мясцовыя саветы, якія адбыліся ў 1948 г. у Брэсцкай вобласці, актыўны ўдзел прынялі 3197 дэлегатак, якія працавалі ў якасці агітатараў, а 7507 – працавалі ў акружных і ўчастковых выбарчых камісіях. У мясцовыя саветы былі абраны 1445 жанчын, з якіх у абласны савет было абрана 18 жанчын, у раённыя саветы – 148, гарсаветы раеннага падпарадкавання – 68, гарадскія саветы – 73, сельскія саветы – 1138[38].

Многія жанчыны з заходніх абласцей не мелі асаблівага жадання працаваць на кіруючых пасадах з-за страху за свае жыцці і жыццё сваіх блізкіх і родных. Польскае незалежніцкае падполле ўяўляла рэальну пагрозу для актывістак. Так, у чэрвені 1948 г. была забіта старшыня Хахлоўскага сельскага савета Маладзечненскага раёна Марыя Саганзыкава, зз-а актыўнай пазіцыі па стварэнню калгасаў у сельскім савеце[39]. Адзначым, што дэлегаткам у заходніх абласцях Беларусі было дастаткова цяжка працаваць. Напрыклад, Маладзе-

[35] Тамсама, л. 124.
[36] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 21, л. 272.
[37] Тамсама, с. 88.
[38] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 20, л. 47.
[39] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 19, л. 410.

чненскі абкам партыі адзначаў, што дэлегатку Н.Глазунову, калгасніцу калгаса імя Сталіна Астравецкага раёна адзін з заможных аднавяскоўцаў усяляк ганьбіць, пагражае і інакш як "большевистская зараза", "колхозная зараза" і іншымі нецэнзурнымі словамі не называе[40].

Савецкія ўлады ўцягвалі жанчын таксама ў антырэлігійную прапаганду. Так, у чэрвені 1948 г. у Радашковіцкім раёне адбыўся аднадзенны семінар са старшынямі і найбольш актыўнымі членамі дэлегацкіх сходаў, на якім абмяркоўвалася пытанне: "Аб рэакцыйнай дзейнасці каталіцкага духавенства і барацьбе з ім"[41].

Многія дэлегаткі актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі бальшавіцкай палітыкі па стварэнні калгасаў. Так, Пружанскі РК КП(б)Б адзначаў, што:

> Ряд женщин-делегаток явились инициаторами в организации колхозов, начали первыми подавать заявления в колхозы, стали настоящими агитаторами за колхозный строй и начали агитировать своих мужей, как делегатка Шеневского сельсовета София Трус при организации колхоза им. Маяковского в деревне Котелки, Бобрук Екатерина, Пашко Надежда Имховик Прасковья и ряд других[42].

Аналагічнае адзначаў Баранавіцкі АК КП(б)Б:

> Следуя примеру женщин-делегаток в деревнях Мантюты, Заречье и Рудня (Бытенский район Барановичской области. – Н.Б.), все крестьянские хозяйства активно вступали в колхоз и в настоящее время (октябрь 1949 г.) Зареченский сельский совет полностью коллективизирован[43].

Гэтае ж самае паведамляў у ЦК КП(б)Б восенню 1949 г. Маладзечненскі абкам партыі:

[40] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 21, л. 13.
[41] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 20, л. 57.
[42] НАРБ, ф. 4п, оп. 49, д. 21, л. 56.
[43] Тамсама, с. 77.

Вилейском районе 2 женщины-делегатки работают председателями колхозов – Новик Анна, в прошлом крестьянка-батрачка, при Польше работала по найму. В 1939 г. была избрана депутатом Народного собрания Западной Беларуси. В 1947 г. вступила в партию, по ее инициативе был организован колхоз имени Ленина в Кузмичевском сельсовете. На первом собрании колхоза колхозники единогласно избрали ее председателем колхоза. С работой председателя справляется хорошо[44].

Жанчыны-дэлегаткі апекаваліся над дзеткамі-сіротамі. Маладзечанскі АК КП(б)Б адзначаў, што:

За период раобты делегатских собраний значительная робаота проведана делегатками и активистками по оказанию помощи детям-сиротам. Женщинами-делегатками и активистками с 1946 г. по 1949 г. сиротам было собрано более 500 тыс. рублей. На собранные средства оказана большая помощь детям-сиротам, который в области насчитывается 1020 человек. В бльшинстве сельских советов области жензины-делегатки и активистки взяли под свій контроль жизнь детей-сирот, находящихся на патронате и опеке, следить за их условиями жизни и учебы[45].

На пачатку 50-х г. палітычнае кіраўніцтва СССР палічыла, што дэлегацкія сходы выканалі сваю задачу і яны былі скасаваныя.

Вынік дэлегацкіх сходаў неабходна разглядаць як спробу партыі не толькі “уключыць” па магчымасці большую колькасць жанчын у кіруючую працу, але і праз іх ажыцяўляць іх ідэйна-палітычнае і ідэалагічнае выхаванне. Разам з жанчынамі і “праз” іх улада ажыццяўляла свае стратэгічные мэты ў прапагандзе сваей палітыкі сярод шырокіх колаў насельніцтва, што садзейнічала стабілізацыі і ўмацаванню савецкай улады.

[44] Тамсама, л. 269.
[45] Тамсама, л. 271.

## Bibliografia

Alferova I.V., *Delegatskie sobranija 1920-h gg. kak proekt podgotovki sovetskich zensczin k upravlenczeskoj dejatelnosti* „Vestnik Czeliabinskogo gosudarsstvennogo universiteta" nr 1, Vyp. 43, s. 46–54 [Алферова И.В., *Делегатские собрания 1920-х гг. как проект подготовки жанщин к управленческой деятельности,* «Вестник Челябинского государственного университета» № 1, вып. 43, с. 46–54].

*Kommunisticzeskaja partija Belorussii v rezoliucijach i reszenijach sjezdov i plenumov CK,* T. 1. 1918–1927, Pod red. V.I. Brovikova, V.J. Krykova, S.E Pavlova, Minsk, 1983 [*Коммунистическая партия Белоруссии в революциях и решениях съездов и пленумов ЦК*, Т. 1. 1918–1927. Под ред.: В.И. Бровикова, В.Я. Крыкова, С.Е. Павлова, Минск 1983].

*Kommunisticzeskaja partija Belorussii v rezoliucijach i reszenijach sjezdov i plenumov CK*, T. 4. 1945–1955, Pod. red. G.G. Bartoszevicza, Minsk, 1986 [*Коммунистическая партия Белоруссии в революциях и решениях съездов и пленумов ЦК*, Т. 4. 1945–1955, Под ред.: Г.Г. Бартошевича, Минск 1986].

Nacionalnyj archiv Respubliki Belarus [Национальный архив Республики Беларусь], f. 4p.

### Creation and activity of women's delegate meetings in Belarus in the 1920-s – mid-1950-s

The Soviet government attached great importance to work among women. First of all, this was explained by the desire to involve women in active party-soviet, trade union and komsomol work. The most common form of such work was delegate meetings, which arose in the early 1920-s and were an active form of involving women in the socio-political life of Soviet society until the mid-1950s. Delegate meetings, as a form of social organization of women, used such forms of activity as theoretical – the study of the works of the classics of Marxism-Leninism and prominent figures of the party and government, and practical – the selection and promotion of women to leading party-soviet, trade union, and economic work.

Keywords: women, party-soviet, trade union and komsomol work, women's delegate meetings, Belarus, political activity